**Давайце абмяркуем.** Чаму апавяданне «Цяцерка» ўключана ў раздзел «Чалавек без Радзімы, што салавей без песні»? Абгрунтуйце сваю думку.

---

**Маўленчая размінка.** Прачытайце загадкі. Пра якія палявыя расліны гаворыцца ў іх? Пры чытанні звяртайце ўвагу на правільнае вымаўленне гукаў [ў], [дз’], [г], [ч], [ц’].

## ЗАГАДКІ



Жо**ў**тае мора ля вёскі
**Ц**іха шапо**ч**а, шумі**ць**.
Сіняе во**ч**ка валошкі
Светла навокал **глядзіць**.



За даро**г**аю на полі
Пры**г**ажун **сцяной** стаі**ць**.
Стройны, соне**ч**ны, вясёлы,
Завушніцамі звіні**ць**.

*Міхась Пазнякоў.*

***Прыва́бны*** — прыемны, чароўны.
***Спо́рыцца дбайна*** — тут: праца ідзе паспяхова.



Правообладатель Национальный институт образования

## ПЯТРУСЬ БРОЎКА

# Песня хлебу

Водар хваёвы,
Сіняе неба,
Кожнае ранне
Рады я хлебу.

Рады я ўсходам
Веснімі днямі
І як гамоніць
Ён каласамі.

Рады — увосень
Спорыцца дба́йна —
Медным руча́йкам,
Што з-пад камбайна.

Большай не маю
Сёння патрэбы —
Кожнае ранне
Рады я хлебу.

Хлеб праз вітрыны
Кожнага кліча,
Сам на паліцы
Сеўшы як быццам.

Ах, як прывабна
Ён выглядае...
Я перад хлебам
Шапку здымаю.

Як нагляджуся,
Дык прыгадаю
Поле без краю
Кожнага краю;

Тых, хто на полі
З лецейка ў лета...
Дзякуй ім, родным,
Дзякуй за гэта!

1. Чаму радуецца паэт кожнае ранне?
2. Як вы разумееце сэнс радкоў:

Хлеб праз вітрыны
Кожнага кліча,
Сам на паліцы
Сеўшы як быццам?



Правообладатель Национальный институт образования

3. Чаму аўтар здымае шапку перад хлебам?
4. Якім прыгадвае паэт хлебнае поле? Знайдзіце і прачытайце адпаведныя радкі.
5. Каму Пятрусь Броўка выказвае падзяку за хлеб на сваім стале? Прачытайце.
6. Падумайце, якія словы трэба вылучыць голасам пры чытанні апошніх радкоў.
7. Пастарайцеся перадаць сардэчную і пяшчотную інтанацыю пры выразным чытанні верша.
8. Чаму ў народзе кажуць: «Хлеб — усяму галава»? Як вы гэта разумееце?

## У свеце прыгожага

1. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Юрыя Мікалаева «Хлябы».





Правообладатель Национальный институт образования

**2. Адкажыце на пытанні.**

1) Які настрой у вас выклікае карціна мастака Юрыя Мікалаева «Хлябы»? Чаму?

2) Што адлюстравана на стале? Пералічыце.

3) Якія прадметы з'яўляюцца галоўнымі на карціне?

4) Як выглядаюць хлябы? Якія фарбы выкарыстаў мастак?

5) Чаму побач з хлябамі намаляваны каласы, зярняткі і соль?

6) У чым сугучны верш Петруся Броўкі «Песня хлебу» і карціна Юрыя Мікалаева «Хлябы»?

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

***Ведаю...***

1. З якіх твораў узяты гэтыя словы? Хто іх аўтар?

а) Куды ні глянь — лясы шумяць,
за полем — рэчка, гай.
І ў сэрцы песні не стрымаць
пра мой любімы край;

б) Не проста ў словы я гуляю —
На мове роднай размаўляю.
У час світальны, вечаровы
Кажу пяшчоты цёплай словы...;



Правообладатель Национальный институт образования